Гужалоўскі, А.А. Палітычны кантроль выдавецкай дзейнасці ў БССР у 1920-1930-я гг./ А.А. Гужалоўскі // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2010. — С. 29-37.

А. А. ГУЖАЛОЎСКІ

ПАЛІТЫЧНЫ КАНТРОЛЬ ВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БССР У 1920—1930я гг.

Пачынаючы са студзеня 1921 г., калі Прэзідыум ЦВК БССР прыняў пастанову «Аб стварэнні Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі і цэнтралізацыі друку», уся літаратурнавыдавецкая дзейнасць, а таксама распаў сюджванне друкаванай прадукцыі ў рэспубліцы канцэнтравалася ў Дзяржаўным выдавецтве Беларусі (ДВБ). Без візы загадчыка ДВБ, на пасаду якога быў прызначаны Я. І. Эйдэльман, да друку не прымаўся ніводны матэрыял. ДВБ таксама ўсталёўвала кантроль за дванаццаццю перыя дычнымі выданнямі і нацыяналізаванымі тыпаграфіямі. Ад самага пачатку існавання дзейнасць ДВБ знаходзілася пад пільным кантролем цэнзурнага ведамства — Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і выдавецтваў БССР (Галоўлітбел). Так, на пасяджэнні калегіі Галоўліт бела 21 лістапада 1922 г. было вырашана перадаць меркаванне ў ЦК КП(б)Б пра тое, што «...Дзяржвыдат захапіўся выпускам філасофскай літаратуры і белетрыстыкі, у той час як варта было б звярнуць увагу на выпуск марксісцкай літаратуры і падручнікаў» [18].

Але ўжо ў наступным, 1922 г. ва ўмовах НЭПа ДВБ прыпыніла існа ванне, а замест яго ў БССР паўстала шэраг новых дзяржаўных і кааператыўных выдавецтваў. У красавіку па ініцыятыве Інбелкульта пачало сваю работу выдавецкае кааператыўнае таварыства «Адраджэнне» (уво сень таго ж года рэарганізавана ў выдавецтва «Савецкая Беларусь»), якое ставіла на мэце выданне кніг па беларусазнаўстве, навучальных дапа можнікаў па ўсіх галінах ведаў, мастацкай літаратуры і інш. У маі ўзнікла кааператыўнае выдавецтва «Наперад», асноўнай задачай якога быў вы пуск прапагандысцкай літаратуры і часопіса «Наперад». На дзяржаўнае выдавецтва «Белтрэстдрук» партыйным кіраўніцтвам рэспублікі ўскла далася задача выпуску масавай сялянскай, камсамольскай, а таксама партыйнай літаратуры, у тым ліку выданне твораў Леніна. Акрамя гэта га, выдавецтва «Белтрэстдрук» было манапалістам у справе выпуску ўсяго перыядычнага друку БССР. У наступныя гады з’явіліся выдавецтвы Цэнтральнага савета прафсаюзаў Беларусі, наркамата земляробства, БДУ і некаторыя іншыя. Найбольш плённа працавала выдавецтва «Са вецкая Беларусь», што ў значнай ступені было абумоўлена асобай яго кіраўніка — вядомага дзеяча беларускага нацыянальнага руху, публіцыста і пісьменніка, рэдактара часопіса «Полымя» З. Х. Жылуновіча (Цішкі Гартнага).

Партыйнае кіраўніцтва БССР імгненна адрэагавала на з’яўленне новых дзяржаўных і кааператыўных выдавецтваў. У 1922 г. з мэтай усталявання над імі ідэалагічнага кантролю ў структуры агітацыйнапра пагандысцкага аддзела ЦК КП(б)Б быў утвораны пададдзел друку. У на ступным годзе пры гэтым аддзеле з’явіўся дарадчы орган — савет друку, куды ўвайшлі прадстаўнікі кіраўнічых структур камуністычнай партыі, камсамола, прафсаюзаў, наркамасветы, цэнтральных газет і інш. Акрамя таго, паранейшаму ўся выдавецкая дзейнасць у БССР знаходзілася пад кантролем Галоўлітбела. Інтэлектуальную атмасферу, якая панавала ў цэнзурным ведамстве, перадаюць праўкі, унесеныя ў творы беларускіх аўтараў, прынятыя да друку ў 1923 г. Так, «Пачатковую геа графію» М. А. Грамыкі дазволілі друкаваць з умовай, што радкі «пра любоў да Радзімы» будуць выкрасленыя і, наадварот, будзе дададзена, што акрамя беларусаў-каталікоў і беларусаў-праваслаўных ёсць яшчэ беларусы-атэісты (яны — найбольш свядомыя). Ад

аўтара запатрабавалі словы «дэмакратычныя свабоды» ўзяць у двукоссе, таму што яны вы карыстоўваюцца для абдурвання працоўных. Я. Коласу ў якасці ўмовы выдання яго аповесці «У палескай глушы» паставілі напісанне слова «Бог» і назваў рэлігійных свят з малой літары. Акрамя таго, аўтару пра-

30

панавалі падкрэсліць ва ўводзінах да аповесц, што падзеі адбываюцца да рэвалюцыі [19].

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі адрадзілася з іншай структурай і крыху зменай назвай (Беларускае дзяржаўнае выдавецтва) ужо ў 1924 г, калі на красавіцкай нарадзе аддзела друку ЦК УКП(б) у Маскве быў заслуханы даклад пададдзела друку агітацыйна-прапагандысцкага ад дзела ЦК КП(б)Б. Па яго абмеркаванні «ў мэтах рэалізацыі дырэктыў партыі ў галіне нацыянальнай палітыкі» было вырашана максімальна скараціць выпуск у БССР рускамоўнай літаратуры, асаблівую ўвагу ў выдавецкіх планах звярнуць на пытанні мясцовага жыцця, узгадніць вы давецкую дзейнасць у рэспубліцы з агульнасаюзнай. Вынікамі рашэн няў, прынятых на маскоўскай нарадзе, было зліццё 26 чэрвеня 1924 г. выдавецтваў «Савецкая Беларусь» і «Белтрэстдрук» у адзінае Беларус кае дзяржаўнае выдавецтва (БДВ). Афіцыйным тлумачэннем дадзенага заходу была няздольнасць выдавецтваў «Савецкая Беларусь» і «Бел трэстдрук» паспяхова выконваць задачы нацыянальнага будаўніцтва па асобку. БДВ, якое ўзначаліў З. Х. Жылуновіч, стваралася як паявое та варыства, статут якога прадугледжваў прыцягненне ў пайшчыкі як дзяр жаўных, грамадскіх устаноў і арганізацый, так і прыватных устаноў і асоб. Асноўным пайшчыкам выдавецтва быў Наркамасветы, паем якога з’яў ляўся ўвесь капітал БДВ на момант яго стварэння. У тым жа 1924 г. пад аддзел друку быў пераўтвораны ў самастойны аддзел друку ЦК КП(б)Б. Праз год, па маскоўскім узоры, з’явіўся яшчэ адзін дзяржаўны орган па нагляду за друкам — Камітэт па справах друку і паліграфічнай прамыс ловасці пры СНК БССР. Ад самага пачатку свайго існавання БДВ як галоўнае выдавецтва рэспублікі знаходзілася пад пільным кантролем цэнзурнага ведамства і аддзела друку ЦК. У лютым 1926 г. Галоўлітбел забараніў ужыванне ў навучальных установах БССР падручніка М. В. Азбукіна «Геаграфія Еў ропы», выдадзенага ў БДВ у 1924 г. [20]. На пасяджэнні калегіі Галоў літбела 10 сакавіка 1926 г. БДВ крытыкавалася за нядбайнасць у пад боры твораў у серыю «мастацкая літаратура для вёскі». Былі забароне ны для распаўсюджвання «Выбраныя вершы» Я. Коласа, таму што «... усе яны былі напісаны аўтарам у перыяд 1908—1913 гг., прасякнуты песімізмам, зараз састарэлі па настроях і акрамя незадаволенасці нічога чытачу не дадуць». «Выбраныя вершы» Ф. Багушэвіча члены калегіі друкаваць дазволілі, але пры ўмове, што ў прадмове да кніжкі будзе патлумачана, калі жыў аўтар і чаму яго вершы карысныя для сялян ства [3].

31

У лютым 1927 г. аддзел друку ЦК КП(б)Б прыпыніў распаўсюджван не спеўніка, выдадзенага вайсковай камісіяй Інбелкульта, патрабуючы змен у тэкстах шэрагу песень і маршаў. На пасяджэнні калегіі Галоўліт бела 12 мая 1927 г. пасля абмеркавання было вырашана дазволіць вы данне ў БДВ адрыўнога календара на 1928 г., пры ўмове пазбаўлення яго функцыі рэвалюцыйных святцаў — у першым варыянце кожнаму дню года ў календары адпавядала рэвалюцыйнае імя (Дэкабрына, Палі граф, Марксіна, Будзёна, Радыё, Савета, Комса, Молат, Аўтанома, Спайка, Сталіна, Плуг, Праца, Рэвалюцыя, Інтэрна, СьценкаРазіна, Калекта, Стачка і інш.). Акрамя таго, укладальнікі календара былі павін ны прыбраць згадкі шэрагу гістарычных падзей, у тым ліку «1746. На радзіўся Тадэўш Касьцюшка», «1887. Нарадзіўся беларускі поэт Алесь Гарун», «1921. Паміж Расіяй і Польшчай падпісана Рыжская ўмова, згод на якой Беларусь падзелена на

дзве часткі — Усходняя (сучасная Савец кая Беларусь) і Заходняя (цяпер пад Польшчай)» [4]. У 1927 г. ЦК КП(б)Б абраў курс на скарачэнне колькасці выдавецт ваў шляхам іх аб’яднання вакол буйнейшых, максімальнае скарачэнне выдання ведамаснай літаратуры ў наркаматах, увязку выдавецкіх пла наў з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. На пасяджэнні сакрата рыята ЦК 14 мая 1928 г. было вырашана лічыць немэтазгодным аргані зацыю каапературыўных кніжных выдавецтваў, а таксама аўтарскіх вы данняў [5]. Гэты курс на працягу 1928—1929 гг. праводзіў у жыццё Камі тэт па справах друку пры СНК БССР. Важныя прапановы, якія можна разглядаць як апошнюю арганіза ваную спробу беларускай творчай інтэлігенцыі пераламіць тэндэнцыю на згортванне свабоды слова прагучалі на нарадзе палітрэдактараў БДВ і Цэнтравыдавецтва, якая адбылася 20 кастрычніка 1929 г. у агітацый напрапагандысцкім аддзеле ЦК КП(б)Б. На ёй было вырашана прасіць ЦК зняць з палітрэдактараў БДВ абавязкі праглядаць і даваць заўвагі па выданнях Беларускай Акадэміі навук, Беларускага дзяржаў нага універсітэта і іншых навуковых устаноў, а таксама ВНУ. Акрамя таго, палітрэдактары прасілі зняць грыф сакрэтнасці з іх дзейнасці з тым, каб іх дзейнасць мела не толькі рэпрэсіўны, але і выхаваўчы ха рактар. Прапаноўвалася публікаваць рэцэнзіі палітрэдактараў на ста ронках перыядычнага друку. У выпадках калі погляды палітрэдактараў БДВ і Галоўлітбела на той ці іншы рукапіс разыходзяцца, пытанне вы рашаецца калегіяльна пры ўдзеле прадстаўніка агітацыйнапрапаган дысцкага аддзела ЦК. Дэмакратычная накіраванасць гэтых прапаноў стане зразумелай, калі ўлічыць, што палітрэдактарамі ў БДВ у той час

працавалі С. М. Некрашэвіч, Міхась Чарот (М. С. Кудзелька), П. Р. Га лавач, Я. П. Каранеўскі, М. І. Белуга і іншыя дзеячы беларускага на цыянальнага руху 1920х гг. Рэакцыя ЦК КП(б)Б на гэтыя прапановы невядома, але зыходзячы з далейшага разгортвання падзей яны не былі пачуты [6]. Напрыканцы 1929 г. у БССР налічвалася пяць рэспубліканскіх вы давецтваў: БДВ, газетначасопіснае выдавецтва ЦК КП(б)Б «Звязда», газетначасопіснае выдавецтва ЦК ЛКСМБ «Чырвоная змена», газет начасопіснае выдавецтва «Савецкая Беларусь», выдавецтва ЦСПСБ. Акрамя таго, дзейнічалі газетначасопісныя выдавецтвы пры пяці аб ласных газетах, а таксама восем рэдакцыйнавыдавецкіх аддзелаў (АН БССР, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, Наркамземе, НДІ імя Леніна, Кніжнай палаце БССР, Беларускім паляўнічым саюзе, Каапбанку, Ветэрынарным інстытуце ў Віцебску). З 1929 па 1931 г. у Мінску дзейнічала аддзяленне Цэнтральнага выдавецтва народаў СССР, якое спецыялізавалася на выданні літаратуры на мовах нацменшасцей БССР. 80 % усёй кніжнай прадукцыі, якая выдавалася ў рэспубліцы, пры падала на БДВ. За першыя пяць гадоў працы агульны аб’ём кніжнай прадукцыі БДВ склаў каля 7, 3 млн асобнікаў кніг, у тым ліку 3 млн пад ручнікаў, 2 млн масавай літаратуры, 700 тыс. — мастацкай, 600 тыс. — дзіцячай і 100 тыс. — часопісаў [1, с. 3]. У адсутнасці заканадаўчай базы, рэгулюючай выдавецкую дзейнасць, важным крокам наперад павінна было стаць «Палажэнне пра дзяржаў ныя і грамадскія выдавецтвы» (прыватных выдавецтваў у 1920я гг. у БССР не існавала), прынятае СНК БССР у студзені 1930 г. Яно праду гледжвала існаванне ў рэспубліцы, акрамя дзяржаўных, таксама гра мадскіх выдавецтваў — «...партыйнага, камсамольскага, прафесійных, кааперацыйных і інш. рэспубліканскага і мясцовага значэння для вы дання і распаўсюджвання газет, часопісаў, кніг альбо іншых твораў дру ку». Выдавецкія планы грамадскіх выдавецтваў зацвярджаліся аргані зацыямі, у структуры якіх яны знаходзіліся, а таксама ўзгадняліся з Камі тэтам па справах друку і аддзелам друку ЦК. Асноўныя патрабаванні новага Палажэння зводзіліся да таго, каб наладзіць сістэму планавання работы выдавецтваў, агульны кантроль за іх дзейнасцю, укараніць прын цыпы гаспадарчага разліку [7]. Неўзабаве гэты ўрадавы заканадаўчы акт атрымаў ідэалагічны

дада так, калі 15 жніўня 1931 г. сакратарыят ЦК КП(б)Б прыняў пастанову «Аб узмацненьні працы Галоўліта па паліткантролю за выпушчаемым пэрыядычным і непэрыядычным друкам». Згодна гэтай пастанове

33

ўзмацнялася папярэдняя цэнзура. Ніводны рукапіс не мог быць надру каваны без дзвюх віз — кіраўніка наркамата альбо пэўнага гаспадарчага органа і палітрэдактара Галоўлітбела, прыкамандзіраванага да выдавец тва альбо тыпаграфіі. Акрамя штатных палітрэдактараў Галоўлітбела, да цэнзарскай працы прыцягваліся пазаштатныя палітрэдактары. Так, у партыйным выдавецтве БССР апошніх было каля шасцідзесяці, якія прадстаўлялі ЦВК, Гістпарт, БелАН, Камвуз, Вярхоўны суд, Наркамас веты, Наркамфін, Дзяржплан і інш. За парушэнне правіл друкавання рукапісных матэрыялаў кіраўнікі ўстаноў, сярод якіх асобна ў пастано ве вызначаліся загадчыкі БДВ, Беларускага аддзялення Цэнтравыдавец тва, прэзідэнт БелАН, а таксама палітрэдактары падлягалі крыміналь най і партыйнай адказнасці. Можна меркаваць, што прыняцце гэтай пастановы падштурхнула абследаванне камісіяй ЦК КП(б)Б работы БДВ, якое праводзілася ў чэрвені 1930 г., у разгар падрыхтоўкі справы «Саюза вызвалення Бела русі» і падчас якога высветліўся шэраг недахопаў, у тым ліку «выпуск 46 рукапісаў, забароненых Галоўлітбелам» [9]. Была праведзена чыстка партыйнай ячэйкі БДВ, арыштаваны былыя афіцэры царскай арміі — загадчык выдавецкага аддзела К. Д. Ламака і супрацоўнік таго ж аддзе ла Ц. Я. Адзярыха. Адначасова праводзілася «ўмацаванне» штатаў рэ дакцый партыйнымі кадрамі [8]. На пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 6 кастрычніка 1931 г. была прыня та пастанова «Аб рабоце Белдзяржвыдавецтва», згодна якой Беларускае дзяржаўнае выдавецтва зноў пераймяноўвалася ў Дзяржаўнае выдавец тва Беларусі (ДВБ). У яго складзе ствараліся асобныя сектары па галі нах кніжнай прадукцыі з перспектывай арганізацыі на іх аснове самас тойных выдавецтваў: партыйнай і палітмасавай; вучэбнай і педагагіч най; сельскагаспадарчай; мастацкай; юнацкай і дзіцячай; эканамічнай, прававой, прафсаюзнай і сацыялістычнага будаўніцтва; вайсковай, фізкультурнай і спартыўнай. Асаблівую ўвагу кіраўніцтва ДВБ павінна было звярнуць на выданне твораў класікаў марксізмаленінізма, палітмасавай літаратуры, падруч нікаў, якія спрыялі інтэрнацыянальнаму выхаванню, кніг і брашур па сельскай гаспадарцы, чые аўтары прапагандавалі калгаснае будаўніцт ва, і нарэшце, мастацкіх літаратурных твораў, якія ўсхвалялі гераізм са цыялістычнага будаўніцтва і класавага змагання, пераробку грамадскіх адносін і новых людзей. Для тэарэтыкаметадычнага абслугоўвання індустрыялізацыі краіны ў Мінску стваралася самастойнае Дзяржаўнае выдавецтва тэхнічнай літаратуры, якое падпарадкоўвалася непасрэдна

34

Вышэйшаму савету народнай гаспадаркі. Для «дапамогі выхаванню і ву чобы новых аўтарскіх кадраў» пры ДВБ, а таксама буйнейшых прамыс ловых прадпрыемствах, калгасах і саўгасах ствараліся кансультацыйныя бюро. Адпаведна пастанове рэдактары газет «Звязда» і «Савецкая Бела русь» павінны былі друкаваць штомесячныя крытычныя агляды выда ваемай ДВБ літаратуры. Асобны пункт пастановы вызначыў дзве арга нізацыі, якім было дазволена займацца кнігагандлем у БССР — ДВБ і Белкаапсаюз [10]. У 1935—1936 гг. рукамі кіраўніцтва Мінскага гаркама КП(б)Б быў арганізаваны разгром ДВБ, зачэпкай да якога паслужыў арышт у 1935 г. вядомага ваеннага дзеяча Г. Д. Гая, з якім некалькі кіраўнічых супра цоўнікаў выдавецтва сябравалі з часоў грамадзянскай вайны. Кіраўніц тва галоўнага выдавецтва БССР абвінавацілі ў нацыяналізме і русафобіі (са 120 кніжак, выдадзеных у 1935 г., толькі 6 былі рускамоўныя). Мена віта гэтым партыйныя ідэолагі тлумачылі цяжкае фінансавае станові шча, у якім апынулася ДВБ. У

1935 г. агульны кошт нерэалізаванай кніжнай прадукцыі, большасць з якой складалі забракаваныя падручнікі, дасягнуў рэкорднай лічбы ў 1 655 236 рублёў. Другім пунктам абвінавач вання былі фінансавыя парушэнні і анархія ў ганарарнай палітыцы, што дазваляла аказваць фінансавую падтрымку аўтарам — ворагам народа. Падобная практыка стварала хваравітую атмасферу ў рабоце выдавецт ва, насаджала ўсеагульную падазронасць. Выконваючы партыйнае даручэнне, у сакавіку 1935 г. следчыя НКУС выкрылі ў ДВБ «групу трацкістаў» на чале з дырэктарам выдавецтва, былым савецкім і дыпламатычным работнікам Ф. А. Браўковічам. «Трацкісцкую групу» вінавацілі ў наўмысным выпуску няякаснай літа ратуры, якая з цягам часу спісвалася ў макулатуру. Так, падчас масавых арыштаў у ДВБ на базе выдавецтва было знойдзена незапатрабаваных кніг ужо на суму ў 3 млн рублёў. Усе яны былі падзелены на наступныя катэгорыі: шкодныя, састарэлыя, ператыражыраваныя, нізкаякасныя, няходкія і маючыя вялікі кошт. У выніку ў 1935 г. з базы выдавецтва пай шло на макулатуру 110 т друкаванай прадукцыі [13]. На працягу 1935 г. былі звольнены з працы, выключаны з партыі, арыштаваны

супрацоўнікаў ДВБ, у 1936 г. — яшчэ 46 супрацоўнікаў з наступнымі фармулёўкамі: «як трацкіст», «за прытупленне класавай пільнасці», «як неадпавядаючы (сын кулака)», «як прагульшчыца (дач ка контррэвалюцыянера Ластоўскага)», «за сувязь з высланым мужам», «як рэгент царкоўнага хору» і інш. Нягледзячы на пакаянныя лісты ў ЦК, дырэктар выдавецтва П. П. Шастакоў у 1936 г. быў выключаны з 36 партыі («эсэр, служыў у царскай арміі») і звольнены з працы. Многія са звольненых былі пазней рэпрэсаваны. Неўзабаве ЦК КП(б)Б пайшоў на крайнюю меру — роспуск партыйнай арганізацыі ДВБ [14]. У сваім лісце сакратару ЦК УКП (б) М. І. Яжову ад 17 верасня 1936 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б М. Ф. Гікала скардзіўся на вельмі цяжкае становішча з кадрамі, якое склалася ў ДВБ. Адсутнічалі дырэктар выда вецтва, загадчыкі сектарамі мастацкай, сацыяльнаэканамічнай літара туры, нацсектара, а таксама пяць рэдактараў. Масавыя рэпрэсіі, якія не абмінулі Галоўлітбел, прывялі да таго, што ў буйнейшых выдавецтвах БССР адсутнічалі палітрэдактары ад цэнзурнага ведамства. На пася джэнні бюро ЦК КП(б)Б 26 верасня 1938 г. было прынята рашэнне пе радаць Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі з падпарадкавання Народнаму камісарыяту асветы БССР у распараджэнне СНК БССР (на правах уп раўлення па выдавецкіх справах) [15]. У сярэдзіне 1930х гг. партыйнае кіраўніцтва БССР звярнула ўвагу на выдавецкую дзейнасць, якая ажыццяўлялася паза межамі ДВБ. У лютым 1935 г. бюро ЦК КП(б)Б прыняло пастанову «Аб скажэннях у перакладах на беларускую мову прац класікаў марксізмаленінізма, выдадзеных БелАН», вынікам якога было звальненне з працы сакрата ра партарганізацыі акадэміі і абвяшчэнне вымовы прэзідэнту БелАН, дырэктару Інстытута гісторыі П. В. Горыну. Узброенае праверанымі партыйнымі рэдактарскімі кадрамі, партый нае выдавецтва БССР у меншай ступені падпадала пад цэнзарскі прэс Галоўлітбела. Але пачынаючы з сярэдзіны 1930х гг. цэнзурныя канф лікты адбываюцца і там. У папрок Партвыдату былі пастаўлены памылкі, недакладнасці і нават контррэвалюцыйныя вылазкі пры перакладзе на беларускую мову класікаў марксізмаленінізма. Была прынята спецы яльная пастанова бюро ЦК «Аб мерапрыемствах па паляпшэнні выда вецкай работы Белпартвыдата і Гістпарта». Для пазбаўлення магчымых памылак пры Белпартвыдаце стваралася спецыяльная камісія на чале з сакратаром ЦК КП(б)Б Д. І. Валковічам. Гэты захад быў выкліканы рэзкім павелічэннем выдання марксісц кай літаратуры, у тым ліку на беларускай мове. Так, калі за 1924—1928 гг. у БССР было выдадзена 28 назваў твораў Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна агульным накладам 194 тыс., то з часу заснавання Белпартвы дата з сярэдзіны 1933 г. да канца 1934 г. — 107 назваў агульным накладам 1,2 млн [11]. Увосень 1937 г.

падчас уздыму хвалі масавых рэпрэсій пы танне пра беларускамоўныя выданні класікаў марксізмаленінізма паў стала зноў, але ўжо ў сувязі з прадмовамі і каментарыямі да іх, зробле-

36

нымі «ворагамі народа», — В. Г. Кнорына, У. М. Ігнатоўскага, А. І. Дзя кава, В. Ф. Шаранговіча і інш. У 1934 г. было ліквідавана Дзяржаўнае выдавецтва тэхнічнай літара туры, у сакавіку 1935 г. — ваеннае выдавецтва БССР, у 1938 г. — Партвы дат пры ЦК КП(б)Б. Працягвалі дзейнасць выдавецтва «Звязда», дзе акрамя аднайменнай газеты выдаваліся часопісы «Бальшавік Беларусі» і «Работніца і калгасніца», а таксама «Советская Белоруссия», дзе выда валася аднайменная газета. У Мінску таксама існавала беларускае ад дзяленне агульнасаюзнага дзяржвыдата. Сур'ёзныя прэтэнзіі беларускіх цэнзараў выклікала мастацкая літа ратура. У 1935 г. папярэдняй цэнзурай былі не дапушчаны да друку ў БДВ аповесць Ю. Віцьбіча «Ціхая руба» «...як засмечаная наццэмаўскай лексікай, пейзажам, пададзеным у саматужным наццэмаўскім стылі». Падобны лёс напаткаў другі том збора твораў К. Крапівы, «...які змя шчаў палітычна шкодныя і грубанатуралістычныя творы», тры зборнікі песень на беларускай мове, «...як састарэўшыя і змяшчаючыя палітыч нашкодныя выказванні» і інш. Вельмі жорсткаму кантролю падлягалі гістарычныя працы і перша крыніцы, у тым ліку ўспаміны палітычных і ваенных дзеячаў. У тым жа годзе наступная цэнзура адабрала з базы БДВ тыражы кніг Г. Гая «Адзі ны з многіх» і «За савецкую радзіму» ў сувязі з «няслушным, не марксісцкім разуменнем ролі асобы ў гісторыі і як змяшчаючыя трац кісцкія трактоўкі па пытаннях грамадзянскай вайны» [12]. Выхаванне новага чалавека вымагала пільнай цэнзарскай увагі да юнацкай і дзіцячай літаратуры. 2 снежня 1938 г. бюро ЦК КП(б)Б пры няло пастанову « Аб скажэнні вучэбнатэматычнага плана па гісторыі для школ у БССР», які быў выдадзены Наркамасветы. Падрыхтоўка плана была расцэнена партыйным кіраўніцтвам рэспублікі як «контр рэвалюцыйная вылазка», план са школ адабраны, а яго аўтар звольне ны з працы, адлічаны з аспірантуры БДУ і выключаны з партыі [16]. Па ідэалагічных прычынах была забаронена нават кніга «Багацці нетраў БССР», якая мела выключна навуковае значэнне (гл. табліцу). Можна лёгка заўважыць, што калі за гады другой пяцігодкі коль касць назваў выдадзеных кніг у БССР скарацілася ўдвая, то скарачэнне агульнага накладу амаль незаўважнае. Гэта тлумачыцца выпускам у 1936—1937 гг. «сталінскай канстытуцыі» і «Кароткага курсу УКП(б)», а таксама класікаў марксізмаленінізма і тагачасных партыйных правады роў гіганцкімі накладамі (з 8,8 млн асобнікаў кніг, выдадзеных у 1937 г., 3 млн адносіліся да палітыкапартыйнай літаратуры).

37

Статыстыка кніжных выданняў БССР у гады другой пяцігодкі [2, с. 125] Год выдання Колькасць назваў Тыраж (тыс.) 1933 1264 10 253 1934 1213 9728 1935 1009 8437 1936 938 9097 1937 639 8833 На 1941 г. у БССР было запланавана, пры захаванні агульнага накла ду кніг у 3 млн асобнікаў выдаць палітычнай, сацыяльнаэканамічнай і ваеннай літаратуры — 599 тыс. асобнікаў, мастацкай — 459 тыс., яўрэй скай — 73, 5 тыс., юнацкадзіцячай і школьнай — 1520 тыс., сельскагас падарчай і навуковатэхнічнай — 416 тыс. [17]. Гэты выдавецкі тэмплан, адшліфаваны папярэднім дзесяцігоддзем цэнзарскай работы, ніяк не быў звязаны ні прапарцыянальна, ні па змесце з сапраўдным попытам чытача і з'яўляўся адной з форм ідэалагічнага прымусу.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларускае дзяржаўнае выдавецтва за 5 год. Матар’ялы для дакладчыкаў. Мінск : БДВ. 1929. 32 с.
2. Волк, А. А. Книгоиздательское дело в Белоруссии / А. А. Волк, А. И. Ракович. Минск : Издво БГУ им. Ленина, 1977. 280 с.
3. Национальный архив Республики Беларусь (далее — НАРБ). Фонд 4п. Воп. 1. Спр. 2332. Арк. 230.
4. НАРБ. Спр. 3546. Арк. 20, 159.
5. НАРБ. Спр. 3758. Арк. 143.
6. НАРБ. Спр. 4596. Арк. 18.
7. НАРБ. Спр. 4602. Арк. 82—87.
8. НАРБ. Спр. 4720. Арк. 30.
9. НАРБ. Спр. 5036. Арк. 148.
10. НАРБ. Спр. 5116. Арк. 44.
11. НАРБ. Спр. 6902. Арк. 309б, 324.
12. НАРБ Спр. 9173. Арк. 65—67.
13. НАРБ. Арк. 82.
14. НАРБ. Спр. 10702. Арк. 36—37.
15. НАРБ. Спр. 12467. Арк. 22.
16. НАРБ. Спр. 12488. Арк. 38.
17. НАРБ. Спр. 13867. Арк. 122.
18. НАРБ. Фонд 42. Воп. 1. Спр. 134. Арк. 5.
19. НАРБ. Арк. 8—9.
20. НАРБ. Спр. 1569. Арк. 3.